ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
13
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 22 (1472)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### УСЕСАЮЗНЫЯ КОНКУРСЫ

студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху і творчых работ навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па грамадска-палітычнай тэматыцы будуць праводзіцца ў 1985—1986 гг. у адпаведнасці з пастановай калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, сакратарыята ЦК ВЛКСМ і прэзідыума праўлення Усесаюзнага таварыства «Веды».

XI Усесаюзны конкурс студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху і VI Усесаюзны конкурс творчых работ навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па грамадска-палітычнай тэматыцы вырашана прысвяціць 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

А. НІКІЦЕНКА.

### ГОРАЧА ВІТАЛІ

байцы атрада імя Фрыца Шменкеля філалагічнага факультэта моладзь Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якая наведала іх. На сустрэчы, якая прайшла ў Палацы чыгуначнікаў імя Ільіча, камандзір атрада Святлана Сіяновіч расказала аб дзейнасці СБА, аб яго поспехах. Потым госці пазнаёмілі нас з гісторыяй сваёй краіны, расказалі пра Франкфурт-на-Одэры — горад, у якім яны вучацца.

Ціха было ў зале, калі байцы атрада імя Фрыца Шменкеля выконвалі пад гітару свае любімыя песні. І не бяда, што госці не зусім добра валодалі рускай мовай. Дружба дапамагала ім разумець сэнс песень. І вось ужо яны пяюць. Асабліва прыемна было, калі мы пачулі песні на рускай мове. Нашы галасы зліліся ў адзін — голас міру, дружбы, салідарнасці.

Т. ПАЛЯЛЕЙ,
студэнтка філалагічнага факультэта.

### ЗАКОНЧЫЛАСЯ

спартакіяда «Здароўе» сярод супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта. Найбольш удала выступілі супрацоўнікі і выкладчыкі фізічнага факультэта (адказны за спартыўна-масавую работу А. П. Кузнечык), факультэта прыкладной матэматыкі (адказны В. І. Рэпнікаў), НДІ ФХП (адказны С. Я. Рубінчык).

Слабы ўдзел у спартакіядзе прымалі кафедры грамадскіх навук, філалагічны, юрыдычны, гістарычны факультэты.

С. ВЯЛЬ.

**КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ**

## ШТО ПАКАЗАЎ ПЛЕНУМ

ІДЭЯ змяніць форму правядзення універсітэцкіх пленумаў у камітэце камсамола ўзнікла даўно і не выпадкова. У ходзе рэалізацыі планаў мерапрыемстваў камітэта камсамола па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі» было прынята рашэнне выкарыстоўваць эксперыментальную форму правядзення пленума. Але як адмовіцца ад звычайных форм, рэгламентаваных патрабаваннямі Статута: даклад, выступленні? Што новае можна прапанаваць?

Гарачую дыскусію ў камітэце камсамола выклікаў матэрыял, надрукаваны ў газеце «Комсомольская правда» аб вопыце правядзення камсамольскай канферэнцыі ў Новасібірскім гаркоме камсамола. У ходзе яго абмеркавання выявілася, што ёсць і ў нашай камсамольскай арганізацыі магчымасці для змены форм, метадаў і стылю работы. І перш за ўсё гэта датычыць пленума.

Вось тады і вырашылі, што на адзін з пленумаў будзе загадзя напісаны даклад і распрацаваны праект пастановы. З імі павінны пазнаёміцца камсамольскія актывісты факультэтаў і прыйсці на пленум з гатовымі думкамі і прапановамі. Такім уяўляўся пленум у ідэале. А сёння мы маем магчымасць меркаваць, ці такім, якім планаваў, убачыў яго камітэт камсамола?

«Аб ходзе выканання ў камсамольскіх арганізацыях юрыдычнага і хімічнага факультэтаў планаў мерапрыемстваў па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі» — такой была тэма даклада. Для абмеркавання на пленуме ўзята работа дзвюх, бадай, лепшых камсамольскіх арганізацый універсітэта. Шмат тут ёсць добрых спраў, пачынанняў, традыцый. Але ў дакладзе ўвага была звернута на недахопы, таму ён атрымаўся такім вострым, праблемным, карацей, дакладам па сутнасці. Чытаючы яго, міжволі параўноўваеш стан спраў на гэтых факультэтах са справамі сваіх факультэтаў. І тут жа паяўляюцца думкі, прапановы, парады — усё тое, з чым можна выступіць на пленуме. Але ж падрыхтаванымі да выступленняў былі, відаць, прадстаўнікі толькі двух факультэтаў: хімічнага і юрыдычнага, тых, чыя работа разглядалася ў дакладзе. А астатнія? Пра астатнія факультэты можна проста сказаць: «Заведама фармальныя адносіны да нефармальных спраў». Не змаглі сакратары камсамольскіх арганізацый факультэтаў (іменна яны павінны былі растлумачыць сутнасць новай формы правядзення пленума факультэцкім актывістам) дапамагчы камітэту камсамола ў правядзенні пленума. І таму дэлегатам было проста незразумела, што ад іх патрабуецца. Нават у самім вядзенні пленума былі недахопы. Гаварылі многа, і ўсё пра надзённыя справы: пра мэтазгоднасць існавання на факультэтах лектарскіх груп, пра складанне планаў, пра прынятую Пастанову ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму».

Тады і ўзнікае думка, ці мэтазгодным было ісці на такую рызыку: мяняць традыцыйную форму правядзення пленума? Куды прасцей з дакладам. Тут усё пададзена, і думаць асабліва не трэба, а калі што-небудзь не так, то выступаючыя папpавяць.

Як быць надалей? Адмовіцца ад не зусім удалай практыкі? Паглядзелі, што камсамольскія актывісты — людзі зацікаўленыя, што хвалююць іх нават дробязі камсамольскага жыцця ды на гэтым і годзе? Або ўсё ж працягваць такую практыку? Стварыць умовы для таго, каб пленум змог працаваць па-сапраўднаму: камсамольскія актывісты маглі думаць, спрачацца, грунтоўна абараняць свае меркаванні, больш прадумана рыхтаваць і праводзіць пленум. Для гэтага патрэбны час і работа, штодзённая, старанная работа кожнага камсамольца, усёй камсамольскай арганізацыі.

А. МАТУСЕВІЧ,
член камітэта камсамола універсітэта.

**СЕСІЯ**

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

## ПОСПЕХАЎ, СТУДЭНТ!

*...КРОЧЫЦЬ СТУДЭНТ па лесвіцы навукі. Усё вышэй і вышэй, бліжэй да таго часу, калі ўручаць яму дыплом, які сведчыць аб заканчэнні універсітэта і дае права лічыць сябе маладым спецыялістам. Але гэта яшчэ чакае кожнага. А зараз —сесія. Напружана рыхтуюцца да яе студэнты. Разумеюць, што ад якасці ведаў залежыць у будучым якасць працы.*

*— Матэматыку, фізіку, любыя дакладныя дысцыпліны, якія патрабуюць штодзённай сур'ёзнай працы, нельга вывучыць за некалькі дзён.— упэўнены дацэнт кафедры тэорыі функцый Фёдар Вітальевіч Чумакоў.— У гэтым яшчэ раз пераконваешся ў час экзаменаў. Ды і іншым прадметам патрэбна адводзіць не менш часу. Усе яны разлічаны на планамерную падрыхтоўку. Цяжка ўявіць, як можна за некалькі дзён вывучыць літаратуру.*

*...Сесія. Яна можа радаваць і засмучаць, прыносіць выдатныя адзнакі і здавальняючыя. Але ўсё залежыць ад тваіх адносін да вучобы. студэнт! Поспехаў табе!*

*М. ШЧАРБАКОВА.*







*НА ЗДЫМКАХ: уважліва слухае экзаменатар адказ студэнткі; добра здае сесію студэнт факультэта журналістыкі В. Бабей; у час падрыхтоўкі.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

**«КРУГЛЫ СТОЛ» РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»**

# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЦІКАЎНАСЦІ

**Вось і ўсё. Апошняе хваляванне ў выглядзе абароны дыплома і — бывай альма матэр!.. Дзень у пэўнай ступені такі жаданы і разам з тым — такі сумны. Пяць гадоў паўнакроўнага студэнцкага жыцця наблізіліся да фінішу. Залікоўка ўшчэнт скрэслена адзнакамі і роспісамі выкладчыкаў, і за кожным з іх — нялёгкая праца на першым, другім ... пятым курсах. Да драбніц ясна ўспамінаецца кожны залік, кожны экзамен — своеасаблівае выпрабаванне ведання прадмета. Прыгадваюцца дні, праведзеныя ў чыталцы, лекцыі, адны такія цікавыя і жаданыя, другія, шчыра кажучы, не зусім. Спрэчкі на семінарскіх занятках, калёквіумах.**

**Успамінаецца ўсё, што запомнілася, знайшло свой яскравы адбітак у памяці. А справы, падзеі і нават асобныя лекцыі, да якіх так і не абудзілася цікавасць ці якія так і не змаглі яе абудзіць, праносяцца перад вачыма нагрувашчваннем аднастайных шэрых кадраў.**

**Пяць студэнцкіх гадоў — не толькі вучоба. І натуральна, што, падводзячы вынікі, сённяшнія выпускнікі думаюць не толькі аб вучобе. Бо жыццё з таго дня, як выпісалі новенькі студэнцкі білет і да ўручэння дыплома, дазвання было напоўнена грамадскімі справамі, цікавымі сустрэчамі, паездкамі, спрэчкамі ў інтэрнаце да позняй ночы, незабыўнымі днямі трэцяга працоўнага семестра...**

**Але, бадай, ніхто так не раскажа пра студэнцкае жыццё, як самі студэнты. А выпускнікі і пагатоў. З гэтай нагоды рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» запрасіла за свой «круглы стол» пяцікурснікаў розных факультэтаў. У размове прымаюць удзел: Алена Палячок, выпускніца механіка-матэматычнага факультэта; Ігар Міклашэвіч, выпускнік фізічнага факультэта; Сяргей Чыгрын, выпускнік філалагічнага факультэта; Святлана Канаш, выпускніца хімічнага факультэта; Мухамед Алі Абдуль-Карым (Йемен), выпускнік факультэта журналістыкі.**

**КАРЭСПАНДЭНТ: Вучоба, як вядома, галоўная праца студэнта. І да яе ў нашай размове мы яшчэ вернемся. Але хочацца пачаць з іншага, на першы погляд, другараднага. Што пакінуць у напамінак аб сабе студэнцкія гады апроч дыплома, дзе адлюстраваны тэарэтычны ўзровень падрыхтоўкі спецыяліста?**

**А. ПАЛЯЧОК:** Для мяне — лёгкасць зносін з людзьмі, што набыла за пяць гадоў грамадскай дзейнасці. З першага да апошняга курса была, як гаворыцца, у самым віры камсамольскага жыцця групы і курса. Спачатку адказвала за шэфскую работу, а з другога курса — камсорг групы.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Лёгкасць зносін. Як ты гэта разумееш, Алена?**

**А. ПАЛЯЧОК:** Кажучы мовай псіхолагаў — кантактнасць. Але мне, будучаму інжынеру, такое недзе крыху ўтрыраванае вызначэнне не вельмі падабаецца. Бо лёгка ісці на кантакт з людзьмі — значыць мець заўсёды раскрытую душу, быць гатовым успрыняць сваім сэрцам чужы боль, чужую радасць.

Да гэтага вываду я прыйшла яшчэ на першым курсе, калі мы з аднакурснікамі ў ролі шэфаў наведвалі Мінскае СПТВ-15. Яго навучэнцы — людзі даволі розныя. За многімі трывала замацаваліся невядома кім і калі навешаныя ярлыкі «цяжкіх» падлеткаў. Настолькі, што яны і самі пачалі ў гэта верыць. Фальшывіць, іграць ролю нейкага дабрадзея было немагчыма. Рана ці позна цябе, як кажуць, раскусяць. У нашых руках была адзіная зброя — шчырасць. Ва ўсім і да канца. І як прыемна пасля было ўсведамляць, што твая праца прынесла плён. Пасля, праз некалькі гадоў, я шмат каго сустракала са сваіх падшэфных, якія сталі добрымі рабочымі.

Вопыт, які набыла ў вучылішчы, вельмі спатрэбіцца ў далейшым. У гэтым я мела магчымасць пераканацца, калі амаль чатыры гады была камсоргам...

**КАРЭСПАНДЭНТ: Калі гаварыць пра вучобу, тут, як кажуць, пытанняў не ўзнікае. Веды, набытыя за пяць студэнцкіх гадоў, спатрэбяцца ў час самастойнай працы. Асабліва напачатку. Але адна справа — вучоба ў ВНУ, іншая — праца на вытворчасці. Ці не з'явіцца багаж набытых у грамадскай рабоце навыкаў непатрэбным?**

**А. ПАЛЯЧОК:** Нікольні. Гавару так упэўнена таму, што пераддыпломную практыку праходзіла на тым прадпрыемстве Віцебска, куды мяне размеркавалі. За некалькі тыдняў знаходжання ў новым калектыве зразумела: вопыт грамадскай работы мне яшчэ паслужыць.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Алена, што ты будзеш часцей за ўсё ўспамінаць са свайго студэнцкага жыцця?**

**А. ПАЛЯЧОК:** Усё. Але і зараз лічу самымі лепшымі днямі ўдзел у трэцім працоўным семестры. На маёй будатрадаўскай форме як-ніяк чатыры нашыўкі. Зроблены яны ў Малдавіі, Казахстане, Якуціі і Беларусі. Шкада, што зараз, пасля заканчэння універсітэта, няма магчымасці паехаць у СБА — у жніўні патрэбна прыступаць да работы.

Пра будатрад можна расказваць гадзінамі, але так нічога і не сказаць. Патрэбна адчуць усю асалоду будатрадаўскага жыцця самому. Таму мая парада студэнтам, якія не былі ў СБА, з'ездзіць абавязкова.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Тэма грамадскай работы ў нашай размове закранута не выпадкова. Яе значэнне і ролю у фарміраванні актыўнай жыццёвай пазіцыі цяжка пераацаніць. Аднак нярэдка так здараецца, што юнак ці дзяўчына цалкам аддаюць сябе грамадскім справам, на вучобу часу не стае. А потым у час сесіі ў заліковую кніжку закрадваюцца тройкі. Таму так многа і часта гаворыцца аб неабходнасці дазволіць камсамольскім актывістам вольнае наведванне лекцый.**

У Святланы Канаш такіх праблем ніколі не ўзнікала. З першага курса яна актыўна ўдзельнічала ў камсамольскіх справах, член камітэта камсамола. А прыкладна год назад Святлана стала членам Бюро ЦК ЛКСМБ. Зараз прымае ўдзел у рабоце рэспубліканскай камісіі па правядзенню Міжнароднага года моладзі. У дыпломе, які неўзабаве атрымае выпускніца хімфака,— толькі выдатныя адзнакі. Цікава, колькі бяссонных начэй гэта каштавала Святлане?

**С. КАНАШ:** Ніводнай. Я ўвогуле ніколі не працую ноччу. І справа не ў адсутнасці прывычкі, а ў адсутнасці неабходнасці. Яшчэ ў школе, дзе таксама была выдатніцай, я навучылася працаваць з кнігай. Такім чынам, на засваенне матэрыялу ў мяне затрачваецца мінімальная колькасць часу.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Ці не вынікае адсюль, што студэнты, якія праседжваюць над падручнікамі «звышурочна», не ўмеюць вучыцца?**

**С. КАНАШ:** Нельга абсалютызаваць. Але рацыянальнага зерня гэтае меркаванне не пазбаўлена. Аднак больш правамоцнае сцвярджэнне, што ў такіх студэнтаў няма сістэмы засваення ведаў. Адсутнасць такога навыку непазбежна прыводзіць да дадатковых затрат энергіі, вольнага часу і нават сну.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Карацей кажучы, перш чым вучыць студэнтаў, патрэбна навучыць іх вучыцца.**

**С. КАНАШ:** Іменна так. На нашым факультэце нават існуе лекторый для першакурснікаў з аднайменнай назвай. Тут старшакурснікі, якія займаюцца пераважна на выдатна, дзеляцца сакрэтамі вучобы.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Аднак лекторый наведваюць па сваёй добрай волі толькі адзінкі. Астатніх задавальняе іх «няўменне». Магчыма, было б мэтазгодным для студэнтаў малодшых курсаў чытаць курс лекцый на тэму, якая фармулявалася б прыкладна так: «Як правільна вучыцца».**

**С. КАНАШ:** Безумоўна, вынік не прымусіў бы сябе чакаць. Сістэма вышэйшай адукацыі прынцыпова адрозніваецца ад сістэмы сярэдняй адукацыі. Таму школьным арсеналам форм і метадаў вучобы карыстацца ў ВНУ проста немагчыма.

**КАРЭСПАНДЭНТ: У апошнія гады ўсё больш гавораць аб вялікай загружанасці студэнтаў вучобай, з-за чаго літаральна не застаецца часу на грамадскую работу, самаадукацыю, заняткі спортам і г. д.**

**С. КАНАШ:** Часцей за ўсё гэта адбываецца з-за няўмення арганізаваць свой рабочы дзень, спланаваць яго правільна. І павучыцца няма дзе. Вось і пакутуе студэнт, кідаецца на першым курсе ад вучобы да грамадскай работы, спартыўных секцый, тэатраў, кіно, кніг... Урэшце атрымліваюцца накладкі, адкладваюцца «на заўтра» справы, якіх з кожным днём становіцца ўсё больш і больш. Зразумеўшы, што за ўсім не ўгнацца і двух зайцаў, як кажуць, адразу не злавіць, такі неарганізаваны студэнт адмаўляецца ад часткі спраў, ахвяруючы нават сваімі захапленнямі.

Натуральна, што за апошні час узрасла інфарматыўнасць, павялічылася разумовая нагрузка на студэнтаў. Але ці змяніліся, скажам, за апошнія 20—25 гадоў метады і формы вучобы і ацэнкі ведаў? Вядома, не. Тут патрэбна шукаць нешта новае, вызначаць новыя шляхі.

**І. МІКЛАШЭВІЧ:** Аднак даволі часта выкладчыкі застаюцца вернымі адной мэце — паспець вычытаць за адведзеныя гадзіны курс лекцый. І як вынік — «сухая» мова, манатоннасць і непераканаўчасць, фактычна пераказ падручнікаў. Адсюль — няўвага студэнтаў на лекцыях. Некаторыя нават чытаюць мастацкую літаратуру ці рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў па іншаму прадмету.

Калі падобнае адбываецца на занятках па спецыяльнасці — яшчэ не так страшна. Ведаеш: калі што не давучыў, запоўніш прабел у час работы. Але калі так пабудаваны і заняткі па грамадска-палітычных дысцыплінах — справа іншая. Бо наўрад ці малады спецыяліст пасля заканчэння будзе мець магчымасць спецыяльна папоўніць запас ведаў па гісторыі ці філасофіі. Гэта па-першае. А па-другое, дзеля чаго было вучыцца пяць гадоў у ВНУ, каб потым давучвацца самастойна? Усяму, як кажуць, павінен быць свой час.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Але ці выкарыстаў ты сам, Ігар, гэты час правільна?**

**І. МІКЛАШЭВІЧ:** Лічу, што маю ўсе падставы на станоўчы адказ. Хаця каштавала гэта дадатковых затрат і вольнага часу, і сіл. Асабліва, паўтаруся, у вывучэнні грамадска-палітычных дысцыплін.

Калі па спецыяльнасці мы яшчэ не можам ацаніць узровень і якасць сваіх ведаў, то ў адносінах да філасофіі малады чалавек можа ўжо меркаваць аб сваім узроўні падрыхтоўкі. Аднак чамусьці прынята лічыць, што студэнтам, якія вучацца па тэхнічных спецыяльнасцях, веданне, напрыклад, сапрамата патрэбна куды болей, чым гістмата ці дыямата. Я рашуча супраць такога меркавання. Асабліва калі прыгадваю лекцыі і семінарскія заняткі па філасофіі. Здаралася так, што пасля заняткаў адразу накіроўваўся ў чытальную залу, каб знайсці адказы на пытанні, якія ўзніклі ў час семінара. На жаль, вырашыць іх з выкладчыкам не заўсёды ўдавалася.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Наша гаворка бярэ відавочны напрамак да спрадвечнай праблемы адносін «фізікаў» і «лірыкаў».**

**І. МІКЛАШЭВІЧ:** Ну, па-першае, я сябе не адношу ні да адных, ні да другіх. Вядома, калі браць у разлік не прыналежнасць да спецыяльнасці, а захапленні і здольнасці асобы. Я не думаю, што за пяць гадоў менш прачытаў мастацкай літаратуры, чым студэнт філфака. Асабліва класікі, як айчыннай, так і замежнай. Вельмі падабаюцца мне творы Ф. Дастаеўскага. Гэтага аўтара я перачытваў не раз.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Але на ўсё патрэбен час...**

**І. МІКЛАШЭВІЧ:** Прадбачу пытанне: ці не за кошт асноўнага вучэбнага працэсу пашыраў свой кругагляд? Не, і яшчэ раз не. Студэнт, які замыкаецца толькі ў сваёй спецыяльнасці, у сваёй галіне і не цікавіцца тым, што адбываецца ў іншых сферах чалавечай дзейнасці, проста абкрадвае сябе. Інакш і не скажаш. Асабліва калі гэта будучы кіраўнік вытворчасці. Пяць гадоў вучобы ва універсітэце на тое і разлічаны, каб не толькі атрымаць спецыяльнасць, але і стаць усебакова развітай асобай.

Фактычна, што сабой уяўляе вышэйшая адукацыя? Гэта засваенне набытых чалавецтвам ведаў. І не па якой-небудзь спецыяльнасці ў прыватнасці, а ўвогуле, у самым шырокім разуменні гэтага слова.

**КАРЭСПАНДЭНТ: А зараз слова — лірыку. Сяргей, што дала табе вучоба на гуманітарным факультэце апроч спецыяльнасці?**

**С. ЧЫГРЫН:** Адназначна адказаць на гэта пытанне мне цяжка. Таксама, як і вызначыць аб'ём набытага багажу ведаў. Нават не ў іх справа. Не менш важнымі з'яўляюцца практычныя навыкі самастойнай работы.

Усё гэта дазваляе ўбачыць, наколькі ты пасталеў як чалавек і асоба, наколькі сур'ёзней пачаў ставіцца да жыцця.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Магчыма, гэтаму спрыяла і творчасць?**

**С. ЧЫГРЫН:** Безумоўна. За пяць гадоў вучобы нямала часу аддаваў свайму любімаму занятку — рабоце над словам. З вершамі, рэцэнзіямі выступаў у часопісах, перыядычным друку, па радыё. Усё гэта фарміравала светапогляд, вызначала грамадзянскую пазіцыю.

Добрай школай з'явілася і літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», нязменным старастам якога я быў з 1981 года. Шчырыя творчыя размовы, спрэчкі дапамагалі зразумець сябе, больш яскрава акрэслівалі жыццёвыя ідэалы.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Не так даўно скончылася пераддыпломная практыка. У пэўнай ступені яна была праверкай на вартасць набытых у час вучобы педагагічных навыкаў.**

**С. ЧЫГРЫН:** Не толькі. Пасля практыкі я задумаўся, што філфак, акрамя падзялення на беларускае і рускае аддзяленні, патрэбна падзяляць яшчэ на педагагічны і творчы паток.

**І. МІКЛАШЭВІЧ:** Як фізфак — на педагагічны і вытворчы?

**С. ЧЫГРЫН:** Іменна так. Растлумачу, чаму. Не ўсе выпускнікі нашага факультэта становяцца школьнымі настаўнікамі. Шмат хто ідзе працаваць у выдавецтвы, рэдакцыі, многія становяцца пісьменнікамі ці паэтамі. Але ўсе яны адчуваюць патрэбу ў творчых навыках, адсутнасць умення працаваць са словам.

Хто становіцца педагогам — не ў лепшым становішчы. Бо ў параўнанні з ВНУ, якія рыхтуюць настаўнікаў, у нас на філфаку неапраўдана мала ўвагі ўдзяляецца педагагічнай вучобе і практыцы.

Строгае размеркаванне, скажам, ужо на трэцім курсе па спецыялізацыі дазволіла б паглыбіць падрыхтоўку спецыялістаў пэўнага напрамку.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Студэнцкія гады называюць непаўторнымі. Гэты эпітэт неаднаразова гучаў і ў нашай размове. Чым жа яны непаўторныя?**

**МУХАМЕД АЛІ АБДУЛЬ-КАРЫМ:** Асабіста для мяне — знаёмствам з Савецкай краінай, яе народам. Без перабольшання скажу, што амаль палову сваіх ведаў я абавязаны зносінам з савецкімі людзьмі — начытанымі, дасведчанымі ў любых пытаннях.

За час вучобы ў Савецкім Саюзе я наведаў многія гарады: Кіеў, Баку, Валгаград, Адэсу, Кішынёў. У саставе поезда дружбы пабываў у Азербайджане, на Украіне. Адпачываў на Чорным моры і Нарачы. Але незабыўнае ўражанне зрабіла на мяне сучасная беларуская вёска, куды ездзіў я ў госці да сваіх сяброў.

**КАРЭСПАНДЭНТ: Як сказаў паэт: вялікае бачыцца на адлегласці. Зараз, з вышыні выпускніка, многае відаць у іншым святле, успрымаецца інакш. Што б хацелася пажадаць студэнтам?**

**С. КАНАШ:** Думаю, выкажу агульнае меркаванне, калі пажадаю студэнтам універсітэта імкнуцца самім рабіць сваё жыццё больш цікавым і змястоўным.

**Матэрыялы да друку падрыхтаваў В. ГРАМОВІЧ,**

## ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

# КАНТРОЛЬ — КАЛЕКТЫЎНЫ

НАСТАЎ гарачы для кожнага студэнта час — сесія. Экзамены, залікі... Выпрабоўваюцца на вартасць тыя веды, якія мы набылі на працягу семестра. І немалаважна, якім чынам будуць пабудаваны гэтыя выпрабаванні.

**Даўно вядома, што выкладчык і студэнт — гэта адзінства двух супрацьлеглых полюсаў. Так ці інакш, але паміж гэтымі полюсамі заўсёды існуюць пэўныя супярэчнасці, якія вырашаюцца ў ходзе заліку ці экзамена. І як вынік гэтага вырашэння — запіс у заліковай кніжцы студэнта. Але не сакрэт, што гэты запіс не заўсёды адпавядае ведам маладога чалавека. Студэнт — у некаторым родзе вынаходнік. І добра, калі вынаходніцкія здольнасці яго накіроўваюцца на служэнне ісціне. Аднак здараецца і так, што студэнт прыкладае ўсе свае намаганні, каб толькі, як кажуць, пусціць пыл у вочы выкладчыку. Няма неабходнасці пералічваць усе метады і прыёмы, іх вялікае мноства. І не заўсёды яны сведчаць аб нежаданні вучыцца або ляноце. Некаторая недасканаласць вучэбнай праграмы, часам празмерна высокая патрабавальнасць выкладчыка вымушаюць звяртацца да падобных «вынаходстваў». З'ява адмоўная ў любым выпадку, чым бы яна ні была выклікана. І гэта прыводзіць да вываду, што неабходна ўдасканальваць форму кантролю і праверкі ведаў студэнта. Такую, якая б змагла не прымушаць чалавека ўзяцца за падручнікі і канспекты, а зацікавіла б яго.**

Якім чынам дабіцца такога выніку? Толькі шляхам выкарыстання новых форм кантролю, шляхам спроб і памылак можна знайсці тую «залатую сярэдзіну», якая б з найбольшай аб'ектыўнасцю дазваляла паставіць знак роўнасці паміж ведамі студэнта і іх ацэнкай.

Вядуцца пошукі ў гэтым напрамку і на аддзяленні палітэканоміі гістарычнага факультэта. Нядаўна на чацвёртым курсе адбылася навуковая канферэнцыя па спецкурсу «Структура і метады кіравання», арганізаваная выкладчыкам гэтага прадмета, доктарам эканамічных навук, прафесарам БДІНГ імя В. В. Куйбышава А. С. Гадуновым. Гэта былі своеасаблівыя заняткі па спецкурсу.

Пасля таго, як былі прачытаны лекцыі, усім студэнтам прапанавалі выбраць найбольш цікавыя ім тэмы і распрацаваць іх глыбей, самастойна пашырыць свае веды.

У час работы канферэнцыі у абмеркаванні праблем па тэмах, якія вывучаліся па спецкурсу, прымалі ўдзел практычна ўсе студэнты. Аднак найбольшай грунтоўнасцю меркаванняў і веданнем абранай тэмы вызначаліся выступленні Алены Цітовай, Паўла Данейкі, Уладзіміра Шастака, Уладзіміра Усоскага.

З ліку студэнтаў была выбрана камісія, якая арганізоўвала абмеркаванне, накіроўвала яго ў патрэбнае рэчышча, ацэньвала работу сваіх аднакурснікаў. Інакш кажучы, мы самі, без дапамогі выкладчыка кантралявалі і правяралі свае веды. Прычым кантроль быў калектыўным, а таму, натуральна, больш аб'ектыўным. Пасля адбылося абмеркаванне самой канферэнцыі, яе работы і вынікаў. Кожны мог сказаць, што спадабалася, на што, на яго думку, варта звярнуць больш увагі пры падрыхтоўцы і правядзенні такіх мерапрыемстваў. Вядома, не абышлося і без недахопаў. І таму адзначаліся нейкія негатыўныя бакі, прапаноўваліся шляхі іх ухілення.

Аднак самае галоўнае — быў пакладзены пачатак пошуку новых, больш эфектыўных форм аб'ектыўнага кантролю і праверкі ведаў студэнтаў.

**В. ШЧЭБЕТ,**
**студэнтка IV курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта.**

*ГАСЦІННА расчыніў дзверы Беларускі дзяржаўны універсітэт для абітурыентаў, якія мараць набыць спецыяльнасць на завочным факультэце. Зараз у іх — час уступных экзаменаў. На паверхах можна сустрэць юнакоў і дзяўчат, якія спешна перагортваюць падручнікі, канспекты або проста засяроджана думаюць, нешта прыпамінаюць. А недзе каля ўваходу ў корпус хвалююцца бацькі. Але ў думках кожны з іх упэўнены: «Мой сын (ці дачка) абавязкова паступіць».*

*Гэты здымак наш карэспандэнт зрабіў на філалагічным факультэце на ўступным экзамене, якія прымаюць дацэнт кафедры беларускай мовы З. Б. Варановіч і дацэнт кафедры беларускай літаратуры Т. І. Шамякіна.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*



## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# ДЗЕ ЎВІШНА, А ДЗЕ ЗАЦІШНА

НЕ ПЕРШЫ год працуе на Віцебшчыне занальны штаб СБА, які фарміруецца універсітэтам. Сёлета пад кіраўніцтвам Шумілінскага штаба будуць працаваць 25 атрадаў з Мінска, сярод якіх дзевяць — універсітэцкія.

Атрады БДУ імя У. І. Леніна, Беларускага політэхнічнага і Мінскага педагагічнага інстытутаў, Мінскага інстытута культуры выканаюць значны аб'ём работ на аб'ектах сельскага будаўніцтва трох раёнаў Віцебскай вобласці. Будаўнічымі атрадамі мяркуецца асвоіць звыш 700 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, байцы СБА будуць таксама працаваць на цагельных заводах і выконваць сельскагаспадарчыя работы.

Зараз завяршаецца падрыхтоўчы перыяд. Ад таго, наколькі эфектыўна папрацуюць СБА у гэты час, залежаць іх поспехі летам. Большасць атрадаў Шумілінскага занальнага штаба СБА гатовы не толькі да высокапрадукцыйнай працы, але і да актыўнай грамадска-палітычнай работы. Ва ўсіх атрадах падрыхтаваны і ўжо чыталіся ў падрыхтоўчы перыяд лекцыі, рыхтуюцца да выступлення агітбрыгады. Летам у атрадах пройдуць Усесаюзныя камсамольскія сходы «Стаханаўскі рытм — кожнаму студэнцкаму атраду», прысвечаныя 50-годдзю стаханаўскага руху, тыдні маладзёжнай салідарнасці, іншыя мерапрыемствы, падрыхтоўка да якіх вядзецца ўжо зараз.

Трывожыць стан спраў ва універсітэцкіх атрадах. Па выніках падрыхтоўчага перыяду толькі адзін атрад БДУ — «Чырвоныя гваздзікі» (хімфак) — у ліку лепшых. Камандзір атрада А. Гарбачова добра справілася са сваімі абавязкамі ў падрыхтоўчы перыяд.

Да сённяшняга дня працягваецца фарміраванне атрадаў імя Прытыцкага і «Кастрычнік» гістфака, «Энтузіяст» і «Фатон» факультэта радыёфізікі і электронікі. За нізкую дысцыплінаванасць камандзіру СБА імя Прытыцкага В. Шрубу занальным штабам аб'яўлена вымова, строга папярэджаны камісар СБА «Мерыдыян» (геафак). Г. Талочка. З-за замены кіраўнікоў, нясвоечасовага фарміравання не прачыталі ніводнай лекцыі, не далі ні аднаго канцэрта атрады «Арыён» (фізфак) і «Фатон».

Безадказнасць камандзіра СБА «Энтузіяст» А. Варанцова пры заключэнні дагавора і на працягу падрыхтоўчага перыяду прывялі да таго, што яго не атэставалі на пасяджэнні занальнага штаба. У атрада ўжо зараз узніклі пытанні з забеспячэннем фронтам работ. І ў гэтым таксама ёсць віна камандзіра.

Ёсць, безумоўна, і аб'ектыўныя прычыны. І ўсё ж пры фарміраванні і падрыхтоўцы атрадаў дапушчаны сур'ёзныя недахопы камітэтамі камсамола і штабамі працоўных спраў факультэтаў.

Роўна год назад на старонках газеты «Беларускі універсітэт» крытыкавалася работа штаба працоўных спраў фізфака. Аднак станоўчых вывадаў не зроблена. Начальнік штаба С. Курбыка і ў гэтым годзе не арганізаваў работу належным чынам. У крайне запушчаным стане справаводства штаба. Практычна стыхійна праходзіла фарміраванне атрадаў, а на пасады кіраўнікоў СБА часам назначаліся людзі, якія не валодаюць адпаведнымі якасцямі. Рэдка наведвалі нарады занальных штабоў камандзіры атрадаў «Альтаір» і «Квант». Ужо ў канцы падрыхтоўчага перыяду змяніліся кіраўнікі атрадаў «Арыён» і «Квант». Настаў, напэўна, час бюро камітэта камсамола строга спытаць сакратара камітэта камсамола фізфака А. Слабадзенюка за недахопы ў арганізацыі работы СБА, якія паўтараюцца з году ў год, за нездавальняючую работу факультэцкага штаба працоўных спраў.

Ужо не раз працоўнае лета пераконвала, што недахопы падрыхтоўчага перыяду адбіваюцца на рабоце студэнцкіх атрадаў. Зараз неабходна сканцэнтраваць намаганні камітэтаў камсамола факультэтаў на іх ліквідацыі, забеспячэнні высокай ступені гатоўнасці СБА да працоўнага семестра.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**камісар занальнага штаба СБА.**

# В'ЕТНАМСКІЯ СУСТРЭЧЫ

Правінцыя Бінь Чы Цьен — самая шматпакутная частка В'етнама. Яна ўтворана з раёнаў па абодва бакі семнаццатай паралелі. Цяпер прайшло ўжо 10 гадоў, як семнаццатая паралель перастала быць граніцай паміж Паўночным і Паўднёвым В'етнамам.

Горад Хюэ — былая (да 1945 года) сталіца В'етнама — цяпер з'яўляецца цэнтрам правінцыі Бінь Чы Цьен, пабраціма Беларусі. Ва універсітэце горада Хюэ на працягу месяца я чытаў лекцыі, якія наведвалі студэнты-фізікі выпускнога курса, выкладчыкі фізікі і хіміі універсітэта, а таксама педагагічнага, сельскагаспадарчага і медыцынскага інстытутаў.

У В'етнаме нельга згубіцца ў натоўпе, як у еўрапейскім горадзе. Ты ўвесь навідавоку. Тыя, хто едзе на веласіпедах, а іх тут тысячы, вітаюць дружалюбна усмешкай і воклічамі «Лін Со!» («Савецкі Саюз!»), «Сін Цяо!» («Добры дзень!»).

За кароткі тэрмін нам удалося правесці вялікую работу. Падведзены вынікі двухгадовага супрацоўніцтва нашых універсітэтаў. Прачытаны два курсы лекцый для студэнтаў і выкладчыкаў. Аказана вучэбна-метадычная дапамога як у выглядзе кансультацый, так і ў пастаноўцы лабараторных работ. Распрацаваны план навукова-даследчых работ па сумеснай тэматыцы і арганізавана навуковая група. Створаны навуковы семінар па праблемах фізікі. Аказана метадычная дапамога па пастаноўцы дыпломных работ. Такі аб'ём работы можна было выканаць толькі пры высокай арганізацыі працы і натхняючай абстаноўцы, якія забяспечылі нашы гасцінныя гаспадары.

Праспект Ле Лоя — адна з ажыўленых вуліц Хюэ. На ёй размешчаны каледж, у якім вучыўся Хо Шы Мін, музей яго імя, універсітэт. Сустрэчныя ручайкі веласіпедыстаў зрэдку перапыняюцца аўтамабілем. Кошыкі з бананамі, папаяй, цэглу, драўніну, гліняныя гаршкі, скрыні і мяхі часцей за ўсё перавозяць на веласіпедах.

Каля саламяных хацін або проста на тратуарах сядзяць жанчыны — гаспадыні перасовачных «кафэ». Чыгунныя печкі з кацялком супу і нізенькія лавачкі-столікі з горкай ляпёшак — тое, што яны прапануюць. Рэальнасць сённяшняга В'етнама пакуль суровая. Не хапае многага неабходнага, але паспяхова дзейнічае наладжаная сістэма размеркавання.

Нашым гідам была дырэктар музея правінцыі Бінь Чы Цьен Чыонг Тхі Бік Кхюэ, выпускніца Ханойскага універсітэта, гісторык па адукацыі, якая раней працавала настаўніцай. Кхюэ — сапраўдная падзвіжніца, якая вельмі любіць тую справу, якой служыць. Яна за два гады стварыла цудоўны музей. Ужо цяпер адкрыта 17 залаў. Макеты і дыяграмы з выкарыстаннем гукавых, светавых і дынамічных эфектаў робяць моцнае эмацыянальнае ўражанне.

Кхюэ ведае герояў і простых працаўнікоў правінцыі і яе ведаюць у паветах. На веласіпедзе аб'ездзіла ўсе паветы, збіраючы матэрыялы для музея. Яна адшукала і аднавіла зямлянкі, дакладней — падземную вёску з вуліцамі даўжынёй больш як два кіламетры, ля берага мора, за 20 кіламетраў на поўнач ад ракі Бенхай. Ей дапамагалі салдаты і школьнікі, спецыялісты з СССР і ВНР. Зроблены падходы, умацаваны ўсе 7 уваходаў, і цяпер можна прайсці па «вуліцах» і «кварталах» падземнай вёскі. Высвечваючы электрычным ліхтарыкам дарогу і цёмныя заглыбленні «кватэр», я хадзіў па гэтых «вуліцах». Тут, у норах-«кватэрах», жылі больш двухсот сем'яў, размяшчаліся склады, былі клуб, калодзеж. Амерыканцы ведалі аб існаванні вёскі і бамбілі пастаянна. На адзін квадратны метр прыпадала больш тоны скінутых бомбаў. Але вёска жыла і змагалася. Тут, пад зямлёй, нарадзілася 17 дзяцей. Трэба было працаваць і ваяваць, і не заўсёды дваццаціметровая тоўшча зямлі магла ўсіх уратаваць. Больш двухсот жыхароў вёскі загінулі ад бамбёжак.

Неяк пасля вячэрняй лекцыі да мяне ў нумар пастукалі. Калі я адчыніў дзверы, невысокага росту мужчына з воклічам «браток!» заключыў мяне ў абдымкі. Гэта быў першы сакратар партыйнага камітэта правінцыі Ву Тханг. Потым мы сустракаліся яшчэ некалькі разоў і шмат гаварылі аб праблемах развіцця эканомікі В'етнама, важнасці нашай дапамогі, у тым ліку ў галіне адукацыі і культуры. Яго жыццёвы вопыт, цяжкія гады работы ў падполлі і барацьбы за вызваленне радзімы выклікалі павагу. Прастата, самакрытычнасць, бачанне праблем заўтрашняга дня надавалі яму непаўторную абаяльнасць. А яго зварот «браток!» уносіў у размову цеплыню і непасрэднасць, хоць ён і ведаў мала рускіх слоў.

Такую ж атмасферу сардэчнасці мы адчувалі і пры сустрэчы з партыйнымі кіраўнікамі, работнікамі грамадскіх арганізацый правінцыі Бінь Чы Цьен, яе паветаў, супрацоўнікамі універсітэта.

Аб нашай рэспубліцы ў В'етнаме ведаюць па трактарах «Беларусь», па МАЗах і многай іншай прадукцыі нашых заводаў. На многіх прадпрыемствах зацверджаны вымпелы Беларусі, якімі ўзнагароджваюцца перадавыя брыгады. А на вечары савецкай песні студэнты факультэта замежных моў душэўна спявалі «Беларусь» І. Лучанка.

Радуюць аптымізм людзей, іх працавітасць, зелянеючыя рысавыя палі, мноства МАЗаў і КамАЗаў, якія часта сустракаюцца на дарогах. Адзін месяц — гэта мала для таго, каб добра пазнаёміцца з краінай, але дастаткова, каб убачыць высокую ўнутраную культуру, гасціннасць в'етнамскага народа, яго веру ў сацыялістычную будучыню, шчырую ўдзячнасць нашай краіне і нашаму народу.

**Э. ШПІЛЕЎСКІ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

**НАШЫ ІНТЭРВ'Ю**

# ЯЕ ВЫХАВАЎ СПОРТ

**Знаёмцеся: Эла Яўсюк, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта, майстар спорту па плаванню, член зборнай універсітэта.**

— Калі захапілася плаваннем? Адразу ж, як пачала вучыцца ў школе. Чаму? Любіла ўрокі фізкультуры, на якіх нас вучылі плаваць. Стала адносіцца да заняткаў сур'ёзна, запісалі ў спартыўны клас, а потым накіравалі ў Рэспубліканскую агульнаадукацыйную школу-інтэрнат спартыўнага напрамку. Там вучылася да сёмага класа, стала кандыдатам у майстры спорту. Пасля заканчэння васьмі класаў трэніравалася ў Цэнтры алімпійскага рэзерву па плаванню, што ва Уруччы. У дзевятым класе — майстар спорту па плаванню.

**— Эла, скажы, калі ласка, ці цяжка было паспяхова вучыцца ў школе і ў той жа час займацца спортам?**

— Вядома, але ў школе я заўсёды знаходзілася ў спартыўным калектыве. Наш працоўны дзень пачынаўся ў шэсць гадзін раніцы. Двухчасовая трэніроўка, урокі, самападрыхтоўка, а вечарам — зноў тры гадзіны трэніроўкі. І так кожны дзень. Зразумела, што тады спорт быў для мяне галоўным. Вялікая адказнасць — уваходзіць у зборную рэспублікі.

Эла Яўсюк прымала ўдзел у шматлікіх спаборніцтвах. Была ў саставе зборнай БССР на VIII летняй Спартакіядзе народаў СССР у Маскве, на Усесаюзных спаборніцтвах 1981 года на прыз газеты «Комсомольская правда», дзе заняла другое месца ў эстафетным плаванні.

**— А як удаецца спалучаць вучобу і спорт зараз, ва універсітэце?**

— Патрэбна сказаць, што ў школе я ўвесь час марыла стаць юрыстам. Вядома, што ва універсітэце спалучаць вучобу з рэгулярнымі трэніроўкамі цяжэй, чым у школе. Давялося размеркаваць свой час амаль па хвілінах. І ўсё ж часта здараецца, што з-за ўдзелу ў спаборніцтвах не заўсёды маеш магчымасць прысутнічаць на лекцыях ці семінарскіх занятках, а бывае, і на сесію спазняешся. Але добра, што выкладчыкі разумеюць гэта.

Бывалі моманты, калі апускаліся рукі, хацелася усё кінуць, адпачыць. Але гэта хутка праходзіла, і я зноў з вялікай ахвотай ішла на трэніроўкі. Зараз я ўваходжу ў зборную універсітэта па плаванню. Гэта, зразумела, забірае шмат часу. Але я стараюся сплянаваць свой дзень так, каб заставаўся час і на вучобу, бо галоўнае зараз — паспяхова здаць сесію.

...Не ведаю, можа і маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што для студэнта галоўнае — вучоба, а без грамадскай работы, без спорту можна абысціся. Толькі Эла думае інакш. Спорт выхаваў у яе характары самыя важныя рысы: самаадданасць, вытрымку, волю і адказнасць. І зараз дзяўчына прымае актыўны ўдзел у спаборніцтвах, абараняе гонар факультэта і універсітэта. Як і раней, трэніруецца два разы ў дзень, каб заўсёды быць у спартыўнай форме. Нядаўна прайшло першынство Белсавета па плаванню. Вельмі парадавала Эла сяброў і выкладчыкаў сваімі вынікамі: два першыя (100 і 200 метраў дэльфінам) і адно другое (200 метраў комплексам) месцы.

— Перш за ўсё Эла — цудоўны чалавек,— сказаў трэнер зборнай універсітэта па плаванню, старшы выкладчык М. Ф. Кузьмянкоў.— Яе выхаваў спорт.

**А. МАСЬКОВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



**НА ЗДЫМКУ: Эла Яўсюк пасля чарговай трэніроўкі.**

**Фота аўтара.**




*Дзяжурны па ЛІФТу В. ПЯРУН.*

**АДМІНІСТРАЦЫЯ ЛІРЫЧНА-ІРАНІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ВІНШУЕ СВАІХ ЧЫТАЧОЎ З ПАЧАТКАМ СЕСІІ!**

# ПАРАДЫ НА ЛЕТА

ЛЕТА. Пара сонца, цеплыні і заслужанага адпачынку. Да адпачынку, у адрозненне ад вучобы, нельга падыходзіць легкадумна, таму мы і вырашылі даць вам некалькі парад. Пачнем з турызму. Гэта — лепшы адпачынак. Ён заключаецца ў тым, што людзі ходзяць пешшу там, дзе маглі б і ехаць.

У турыстычным паходзе мы раім ісці ланцужком, прычым самага моцнага патрэбна ставіць апошнім. Ён будзе падбіраць і несці кінутыя ўсімі рэчы.

Калі да вашага вогнішча падышоў воўк, хавайце ўсё спіртное: па яго слядах могуць прыйсці паляўнічыя.

Бульбу з сабой не бярыце. Яе вы можаце накапаць у любым калгасе. Калі калгаснікі, якія ўбачылі вас, узнімуць крык — не палохайцеся. Проста вас прынялі за студэнтаў, і гэта крык радасці.

Дача — кузня здароўя! Дачны адпачынак заключаецца ў тым, што людзі плацяць грошы за тое, што ў турыстычным паходзе яны мелі б бясплатна.

Пастарайцеся адразу ж пасябраваць з сабакам гаспадароў: будзе ў каго пераначаваць, калі з горада прыедуць госці.

Дачны адпачынак вы можаце стварыць і ў гарадскіх умовах. Для гэтага адключыце ваду, газ, святло і аддайце дзвесце рублёў суседцы. Калі ж вам падабаецца дача з тэрасай, выйдзіце на балкон і аддайце суседцы яшчэ пяцьдзесят рублёў.

Чарнаморскае ўзбярэжжа — усесаюзная здраўніца! На поўдзень звычайна імкнуцца людзі, якія недастаткова стаміліся за час вучобы.

На поўдні хадзіце ў лямцавым капялюшы і цёмных акулярах, прыкрываючы нос паперкай. Гэтак вас не змогуць пазнаць сяброўкі жонкі.

Не заплывайце далёка ад берага. Памятайце, зямля ў нашай краіне, у тым ліку і ваша месца на пляжы, належыць усяму народу.

Дарэчы, вы можаце апынуцца на беразе мора і не выходзячы са сваёй кватэры. Для гэтага вазьміце тазік, наліце ў яго вады, укіньце драбочак солі і апусціце туды ногі. Калі вада даходзіць толькі да шчыкалаткі — лічыце, што вы на рыжскім узбярэжжы. Калі вада даходзіць да каленяў — можаце лічыць, што вы на паўднёвым беразе Крыма. А калі ў вас вялікая сям'я і ўсе хочуць паставіць ногі ў адзін тазік — значыць вы ў Сочы.

Калі вы засвоіце нашы парады, можаце смела выпраўляцца на канікулы. Пасля летняга адпачынку вы будзеце здольны займацца любой справай, нават разумовай.

# САКРЭТ «ФІРМЫ»

НАЧЫТАЎШЫСЯ ў друку навуковых артыкулаў аб усеагульнай камп'ютэрызацыі і рабатызацыі, цікаўны ад нараджэння Вечны Студэнт кінуўся даведацца, як жа рыхтуюць спецыялістаў на факультэце прыкладной матэматыкі Белдзяржуніверсітэта, якім давядзецца ажыццяўляць гэтыя задумкі. Прыстроіўшыся ў хвост натоўпу, прытупаў ён у 296-ю аўдыторыю. Страсці там накаліліся, далей няма куды.

— Чаго гэта вы сварыцеся, дзяўчаты? — спытаў ён у калег-студэнтак.

— Чаго, чаго? Не бачыш хіба — з вылічальнага цэнтра ні тэлеграмы няма, ні раздрукоўкі, ды і калоды толькі палова.

— А я ўжо другі тыдзень закладваю перфакарты, а назад нічога не вяртаецца — прорва нейкая!

— А на чым жа вы лічыце? — спытаў Вечны Студэнт.

— Ды на мікракалькулятарах, калі пашанцуе, а не — дык на паперы ў слупок перамнажаем. Ды і калькулятары тыя невядома якога «узросту», усе паламаныя.

Вечны Студэнт паглядзеў на перапоўненыя перфакартамі скрынкі з-пад абутку і падумаў пра сябе: «Бедалагі...» Але ж крыху ўзбадзёрыўся, што ФПМ вельмі ганарыцца сваёй вылічальнай залай. Стрымгалоў паімчаўся ў 178-ы пакой...

Ярка зелянелі нейкія лічбы на экранах дысплея, а васьмёра студэнтаў і выкладчык ад няма чаго рабіць драмалі ў крэслах.

— Што гэта з вамі? — спытаў Студэнт.— Чаго загараеце?

— Ды не мы, а сістэма *«PRIMUS»*.

— І даўно?

— Ды за дзве гадзіны ўжо хвілін сорак пяць, а то бывае і болей, зусім нічога не лічым.

— Хто ж у тым вінаваты?

— Мы думаем, што апаратары нічога не ўмеюць, а апаратары гавораць, што сістэмныя праграмісты нічога не ведаюць, а сістэмныя праграмісты...

— ...І як жа вы змагаецеся з гэтай бядой?

— Ды пішам дакладныя дэкану, а дэкан нясе іх на вылічальны цэнтр, а цэнтр...

— ...Пайду лепш на цэнтр, сам разбяруся.

З вялікай цяжкасцю выпрасіўшы ў дыспетчара машынны час, выйшаў Вечны Студэнт у начную змену. Такіх выпрабаванняў у яго яшчэ не было! Трэба прабіць некалькі перфакарт, а перфараты паламаныя, прыстасаванне ўводу ледзь працуе, папера рвецца, сістэма, дыскаводы заядаюць. Затым машына зусім спынілася. Дзяжурныя апаратары ледзь адшукалі зменнага інжынера. Той прыйшоў, таргануў некалькі кнопак, штурхнуў нагой у панэль і вынес дыягназ: «Даўно выкідваць патрэбна гэты зломак, толькі час у людзей марнуе. Заўтра ж зноў на прафілактыку паставім».

Раніцой знясілены Вечны Студэнт цягнуўся дадому са скруткам разлікаў пад пахою і нявесела філасофстваваў: «Камп'ютэрызацыя называецца! З адной знятай з вытворчасці ЭВМ «Мінск-32», з адной дабітай і адной амаль дабітай ЕС-1022 і толькі адной новай ЕС-1035 з васьмю дысплеямі на ўсіх студэнтаў, на ўсе навуковыя і гаспадарчадагаворныя работы. Які тут сусветны ўзровень, тут хаця б за прагрэсам паспець.

Але крыху паразважаўшы, Вечны Студэнт павесялеў:

Але ж малайцы выкладчыкі факультэта прыкладной матэматыкі. З такой тэхнікай і такіх спецыялістаў рыхтуюць! І як гэта ім удаецца?



Адкажаш яшчэ на адно пытанне, пастаўлю пяцёрку.



Вось тут спакойна падрыхтую канспекты урокаў, а то ўсё сходы ды нарады.

**АМАЛЬ СУР'ЁЗНА**

# НАПАМЯЦЬ

— А ВЫ ШТО думаеце, Гарбузевіч, адносна выступлення Карамзуева? — гучна спытаў старшыня сходу ў дробнага, сіваналосага чалавечка, які сядзеў ля самага акна.

Гарбузевіч праспаў добрыя дзве гадзіны, падпёршы лоб рукою, так, што ўсе думалі, нібы ён думае.

— Я лічу, што Іван Апанасавіч правы,— упэўнена сказаў Гарбузевіч.— На самай справе, для павышэння паспяховасці на ўсіх курсах неабходна ўзмацніць кантроль за наведваннем лекцый студэнтамі.

— А што вы скажаце аб прапановах Пятра Філімонавіча?

— Лічу іх нерэальнымі. Мы не зможам арганізаваць кожную раніцу дзяжурства ў інтэрнаце выкладчыкаў, каб тыя будзілі студэнтаў на заняткі. У нас малы штат.

Гарбузевіч вяртаўся дадому разам з маладым аспірантам, які ўпершыню прысутнічаў на творчай нарадзе выкладчыкаў факультэта.

— Выдатна, як вы выступілі,— у захапленні гаварыў ён,— цікавыя, свежыя думкі.

— Дык я ж праспаў дзве гадзіны. Гэта вам па сакрэту...

— Неверагодна, як жа вы даведаліся, хто аб чым гаварыў?

— Любы мой! Я тут ужо чвэрць стагоддзя выкладаю. На кожнай нарадзе прысутнічаю...

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

13 чэрвеня 1985 г.
Зак. 2635. АТ 13403.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.